# ВЕРА І ТВОРЧАСЦЬ: ТРАДЫЦЫІ СТВАРЭННЕ ЛІТУРГІЧНАГА АДЗЕННЯ

**Голуб К. А.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – Сняжыцкая А. С.

Падчас Святой Імшы мы апускаемся ў яе сакрамэнт, рэдка задумваючыся пра дэталі. Адзенне святара, біскупа, іх руху, словы пропаведзі – усё гэта зліваецца ў адзінае цэлае, звыклае і знаёмае. Мы толькі бегла заўважаем колер адзення, засвоены з дзяцінства: фіялетавы – пакаянне, чырвоны – кроў пакутнікаў, белы – чысціня і ўрачыстасць, чорны – жалоба, зялёны – жыццё і надзея. Літургічнае адзенне заклікана падкрэсліць прыгажосць святадзейства, але нямногія ведаюць, што за яго выбарам і дэталямі стаіць захопленая карпатлівая і адказная праца.

Мэтай дадзенай працы з'яўляецца знаёмства з ўнікальным вопытам стварэння літургічнага адзення на Беларусі.

Майстэрня "Sacris Vestibus" была створана дзесяць гадоў таму [1]. Вядома, вопыту пашыву такіх вырабаў не было, але задума была надзвычай цікавай. Падчас размовы з кіраўніком майстэрні Л. М. Прывалавай, была засяроджана ўвага на тым, што пачыналі, зразумела, не з раскрою, а з вывучэння гісторыі стварэння адзенняў традыцыйнага лацінскага абраду, бралі звесткі ў Інтэрнэце, эксперыментавалі, прыслухоўваліся да меркавання братоў-капуцынаў, парадаў святароў. Дапаможнік на беларускай мове, які выйшаў да таго часу, «Святая Імша» стаў настольнай кнігай.

Ідэя стварэння літургічнага адзення ў Маладзечна (гэта адзіная ў Беларусі майстэрня) не зводзілася толькі да пытанняў цэнаўтварэння, хоць вазіць яе з Польшчы, чым займаліся святары, было і застаецца дорага. Гэта ідэя ўвасабляла ў сабе яшчэ адно запаветнае жаданне аўтара праекта. Усе добра памяталі, што паляк-капуцын, які будаваў касцёл св. Казіміра, захапляўся гісторыяй Беларусі і быў улюбёны ў беларускую мову, надзвычай высока цаніў культуру нацыі і жадаў, каб у літургічны ўбор для святароў Беларусі паступова ўводзіліся беларускія матывы, якія падкрэсліваюць нацыянальную самабытнасць і ўнікальнасць.

У майстэрні пануе атмасфера творчасці. Тут сабраны альбы для святароў, лектараў, для тых, хто ўпершыню прыступае да Святой Камуніі. Раскошныя арнаты і комжы, упрыгожаныя сімваламі хрысціянства і беларускім арнаментам, ззяюць побач з алтарнымі абрусамі, на якіх намалявана Святое сямейства, а сціплы палявы васілёк, вышыты роўняддзю, дадае пяшчоты. Беларускія матывы праймаюць большасць вырабаў, народжаных у гэтай



Рэпазіторый ГрГМУ

майстэрні, дзе асартымент дзівіць сваім багаццем. Тут ствараецца не толькі літургічнае адзенне для набажэнстваў, упрыгожанае традыцыйнай касцельнай вышыўкай, аплікацыямі, карункамі, шнурамі і пэндзлямі, але і абразы з вобразамі святых, якія ўпрыгожваюць храмы, а таксама хрысцільнае адзенне для немаўлят.

У гэтай майстэрні, дзе веды, уяўленне і фантазія зліваюцца разам, чалавечыя рукі робяць прыгажосць, увасабляючы жаданне заказчыкаў і служачы высокаму прызначэнню – упрыгожыць і ўзвялічыць святыя рытуалы.

Такім чынам, майстэрня стварае харугвы для храма, якія натхняюць вернікаў, арнаты, вышытыя з любоўю і майстэрствам. Тут дзверы заўсёды адкрыты не толькі для тых, хто прысвяціў сваё жыццё Богу, але і для ўсіх, чыё сэрца адгукаецца на духоўнае. У гэтай майстэрні кожны хрысціянін можа знайсці тое, што кране яго душу і ўпрыгожыць яго веру.

Літаратура:

1. Вера і творчасць [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: http://sacris.by/ru/content/4-about-us. – Дата доступу: 16.09.2024

## ЗАХАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНЫХ ТРАДЫЦЫЙ НА ПРЫКЛАДЗЕ ПІНСКАГА РАЁНА

**Дваранiновiч Д. А.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – Сняжыцкая А. С.

Актуальнасць дадзенай працы заключаецца у тым, што захаванне культурнай спадчыны – гэта важная задача, якая патрабуе комплекснага падыходу. Яна ўключае ў сябе не толькі матэрыяльныя аб'екты, такія як архітэктурныя помнікі, музеі і бібліятэкі, але і нематэрыяльныя каштоўнасці, такія як фальклор, традыцыйныя рамёствы, песні, танцы і мова.

У сучасным свеце, дзе культурныя традыцыі сутыкаюцца з выклікамі глабалізацыі і мадэрнізацыі, захаванне іх становіцца ўсё больш складаным. Аднак важна памятаць, асабліва маладому пакаленню беларусаў, што традыцыі не павінны быць застылымі ў мінулым. Яны могуць і павінны развівацца і трансфармавацца, адаптоўваючыся да зменлівых рэалій.

Адным з важных інструментаў захавання культурнай спадчыны з'яўляецца вывучэнне нацыянальных традыцый, правядзенне майстар-класаў, стварэнне музеяў і культурных цэнтраў. Усё гэта дапамагае перадаць каштоўнасці будучым пакаленням. Аналіз інфармацыю з інтэрнэт-рэсурсаў паказаў, што сучасныя тэхналогіі таксама могуць адыграць важную ролю ў



Репозиторий ГрГМУ